ЛАНДШАФТ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ляціць над Нёманам еўра

Чым жа балтыйскі ландшафт лепшы за беларускі? Чым беларускі горшы за балтыйскі? Ведаеце, гэтыя пытанні тут адназначна лішнія. Праект называецца так, бо ахоплівае тэрыторыю басейнаў рэк, якія ўпадаюць у Балтыйскае мора. У нас гэта найперш Нёман. У праекце ўдзельнічаюць 15 партнёраў з 7 краін. Дамінуе Шведскі ўніверсітэт сельскагаспадарчых навук. Інтарэсы Беларусі абараняюць БДТУ, «Белдзяржлес» і Навагрудская лясная гаспадарка.

Паводле слоў **Міхаіла КУЗЬМЯНКОВА, намесніка генеральнага дырэктара па навуковай рабоце «Белдзяржлесу»,** ландшафт Навагрудчыны сапраўды ўнікальны: маляўнічае возера Свіцязь, 47 рэчак, 20 ручаёў, а ў верхнім цячэнні на 77 кіламетраў раскінуўся Нёман з прытокамі. Лясы — гэта 38% тэрыторыі раёна (між іншым, 5 тысяч гектараў забалочана). Вось якая аптымістычная статыстыка атрымліваецца.

Што ж такое «Балтыйскі ландшафт у Беларусі» сёння? Адказвае Міхаіл Кузьмянкоў: «Гэта аналіз і аўдыт. Гэта інавацыйныя падыходы да ўстойлівых лясных ландшафтаў у нёманскім басейне». Праграму «Балтыйскі рэгіён» зацвердзілі без нас яшчэ ў 2007-м. Мы ж па лясных рэсурсах далучыліся літаральна сёлета.

Здаецца, Беларусь на шапачны разбор усё ж такі паспела. А як жа іначай? Агульны бюджэт праекта склаў 3 мільёны 300 тысяч еўра. 423 тысячы — нашы. Фінансы яўна і не думаюць спяваць рамансы. На што ж яны пойдуць? Найперш на стварэнне інфармацыйнай платформы.

Самі не з вусамі

«Вызначылі плошчу лясного фонду, аб'ём рэсурсаў, а таксама найважнейшыя паказчыкі: лясістасць, запасы драўніны, лясны склад, аптымальныя памеры нарыхтоўкі драўніны на асобнай тэрыторыі», — адзначае намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце «Белдзяржлесу». Створаная інфармацыйная платформа — база для ацэнкі рэсурсаў, якая і будзе выкарыстоўвацца падчас маніторынгу.

Выдатна, але няўжо для таго, каб сабраць інфармацыю і праманіторыць сітуацыю, неабходна дачакацца, пакуль з неба зваліцца чарговая міжнародная праграма? А самастойна не праводзім? Як высветлілася, такая работа праводзіцца заўсёды, але крыху іншым чынам. Самае слабае звяно ў гэтым выпадку — адміністрацыйныя межы. Калі штосьці маніторым, то выключна ў межах адміністрацыйных адзінак і толькі так: гэта яшчэ мая тэрыторыя, а далей — суседняга раёна. Адпаведна, сваю праналізавалі — і ўсе шчаслівыя. Праект «Балтыйскі ландшафт» мае на ўвазе прынцыпова новы падыход — басейнавы. Ёсць тэрыторыя басейна Нёмана, і экспертам усё роўна, які гэта раён (гэтая праграма закранае і Навагрудскі, і Карэліцкі).

Самы час схапіць праблему за хвост: Нёман паволі страчвае сваю паўнаводнасць, зніжэнне ўзроўню грунтовых водаў прымушае пакутаваць прынёманскія лясы. «Мы вылучаем водаахоўныя зоны, лясныя стужкі, дзе ўсталёўваем пэўны рэжым (па сутнасці, усе лясы выконваюць водаахоўную функцыю). Аналізуем прытокі Нёмана. Якую яны маюць лясістасць? Нёманскі басейн складаецца з басейнаў рэк, што ў яго ўпадаюць. Такіх рэк першага парадку з працягласцю больш за 100 кіламетраў налічылі 10. Цяпер разглядаем лясістасць кожнай ракі. Калі яна нізкая (15—20%), то ўзнікае наступнае пытанне: а ці не шкодзяць зацверджаныя спосабы высечкі? Верагодна, нельга жорстка высякаць, а толькі выбарачна», — разважае Міхаіл Кузьмянкоў.

У зубах праўды няма

Значыць, будзем вінаваціць высечкі? На добры лад, дык трэба іх забараніць, пакуль не паспелі наламаць дроў з прамым і пераносным значэннях. Проста цвёрда паставіць на сваім — і тае бяды! Але ж не! Праблема гуляе з намі ў хованкі. Справа ў тым, што высечкі — гэта толькі маленькая кропля. Вінаваціць будзем не аморфнае, а вельмі канкрэтнае, нават жывое. Памятаеце рэкламны ролік зубной пасты, які круцілі гадоў 10 таму? «Бабёр, а чаму ў цябе такія белыя зубы?». Дык вось. Менавіта гэтае мілае стварэнне і заслугоўвае кары. Бабры будуюць і будуюць плаціны, і меліярацыйныя каналы таксама не прапускаюць. Так утвараюцца водныя аб'екты бабровага паходжання. Падымаецца ўзровень грунтовых водаў. Затапляецца каранёвая сістэма, і дрэвы хутка высыхаюць. Асабліва пакутуюць ельнікі. Як жа быць? Няўжо рукамі разводзіць?

«А вось гэта велізарнае пытанне. Ці то займацца адстрэлам і адловам, ці то перасяляць іх. Праблема пакуль знаходзіцца ў падвешаным стане», — падкрэслівае намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце «Белдзяржлесу». Вучоныя з Міністэрства лясной гаспадаркі і Міністэрства прыродных рэсурсаў сцвярджаюць: колькасць баброў перавысіла 60 тысяч. Вось гэта нараджальнасць! Адзінае, пра што нельга забывацца ў такой сітуацыі, гэта пра… вераб'ёў. Калісьці кітайцам верабейчыкі перашкаджалі: маўляў, знішчаюць шмат збожжа. Перастралялі няшчасных птушак, і зерне з'елі насякомыя. Вось яна, праўда жыцця.

Раз — балота, два — балота

Раней актуальнае «людзі на балоце» цяпер, пасля колькіх хваль асушэння, надзённае ўжо не зусім. З'явілася новае. У нашым палку часта прыбывае людзей, якія скардзяцца на ўзровень вады ў калодзежах. Ён падае. Вядома ж, кацім бочкі на меліярацыю: «Развялося асушальнікаў гэтых». Таму асобны напрамак «Балтыйскага ландшафту ў Беларусі» — ацэнка меліярацыі. Як асушэнне ўплывае на водны рэжым і стан лясоў? Ці абараняюцца інтарэсы мясцовых жыхароў? Калі не, то на якое ліха нам такія праекты? Закон адзін: усё, што ні робіцца, — для беларусаў.

«Мы павінны вызначыць эфектыўнасць меліярацыі, наступствы, мэтазгоднасць яе далейшага правядзення ў лясах і на палях каля лясоў. Далей мы павінны падрыхтаваць адпаведныя прапановы пра шкоднасць меліярацыі ў пэўных тыпах лесу. Верагодна, яе адмоўныя наступствы звязаны з парушэннем правіл асушэння: зрабілі глыбіню асушальных каналаў большай, чым праектавалі, або няправільна іх размясцілі».

Перасыханне ручаёў, невялікіх рэчак, зніжэнне ўзроўню вады ў калодзежах людзі звязваюць з меліярацыяй не проста так. Логіка ёсць. Але ў «Белдзяржлесе» запэўніваюць, што перасыханне, зніжэнне ўзроўню грунтовых водаў сустракаецца не толькі на тэрыторыях, дзе рабілі меліярацыю. Нават у аддаленых месцах назіраецца тое ж самае. Якая ж тут меліярацыя? Клімат. Гэта ён паволі змяняецца.

«Ляжанне» як мастацтва

Турызм — сістэма арганізаваная (праўда, не ў Навагрудскім раёне). Безумоўна, стваральнікі «Балтыйскага ландшафту ў Беларусі» выдатна разумеюць: яшчэ паспеем з козамі на торг. Таму цяпер — аналіз. Пакуль спецыялісты вывучаюць праблемы, возера Свіцязь наведваюць масава. Набліжаецца вечар пятніцы — і пачынаецца. Едуць машыны, а за заднім шклом ужо качаецца галоўка капусты: ноччу штосьці варыцца будзе. У Навагрудскім раёне такіх турыстаў называюць «лежабокамі». І хоць тыповы «лежабок» не заўсёды «плячысты на жывот», ён у любым выпадку мастак паляжаць. І каб толькі аніякай шкоды не рабіў, але ж… Праект дапаможа звесці на нуль усе магчымыя «але ж» — скажам, змяніўшы турыстычны маршрут.

Толькі «за»

У чым жа соль праграмы? Беларусь, Польшча, Фінляндыя і Швецыя змагаюцца з экалагічнымі праблемамі плячо ў плячо. Так, кожны на сваёй тэрыторыі, але тым не менш маем канферэнцыі ў Познані, дзе абменьваемся вопытам, пракладваючы дарогу супольна. Значыць, міжнародныя дэкларацыі не завісаюць дзесьці «ў трох метрах над узроўнем неба». Не, яны рэалізуюцца. Калі міністры ўсіх еўрапейскіх краін падпісалі дэкларацыю «Лес і вада», калі мы зацвердзілі нацыянальную праграму «Чыстая вада», то вырашылі захоўваць водныя рэсурсы ў належным стане.

«Балтыйскі ландшафт у Беларусі» заканчваецца сёлета, а затым — вынікі. Наколькі вядома, будзе і працяг. Ацэнка стану водаў, лясоў — гэта толькі кветачкі. Блізіцца восень, і яны адцвітуць. З'явяцца ягадкі. Вось так рухаемся ад тэорыі да практыкі.

Вось якая глабалізацыя адназначна нам даспадобы. Калі ласка, дапамагайце. Мы ж не супраць. І апошняе: «Дружа бабёр, збірай чамаданы!»

Маргарыта СІДАР.

■ Цырк дый годзе!

ЦУДЫ НА «АЎСТРАЛІЙСКІМ»… ЛЁДЗЕ!

Катанне на каньках, акрабатыка, дрэсіраваныя папугаі і левітацыя. Такім нечаканым спалучэннем абяцае здзівіць новая праграма, прэм'ера якой адбудзецца ў Белдзяржцырку 7 верасня.

…Пакуль ідзём у залу, заўважаем за кулісамі вялізныя дэкарацыі, а бліжэй да арэны пачынаем адчуваць нязвыклую прахалоду, нібы на катку. Падрыхтоўка да «цудаў» ідзе поўным ходам…

— Шоу пад назвай «Чараўніцтва на лёдзе» — гэта вельмі каларытнае прадстаўленне, — расказаў аўтар, прадзюсар і мастацкі кіраўнік праграмы Абраам Кастанян. — Тут спалучаецца акрабатыка, ілюзія, дрэсура. Прысутнічае і жывая музыка. Лядовае пакрыццё, на якім будуць выступаць артысты, ствараліся спецыяльна для арэны беларускага цырка, — дадаў ён.

Лёд сапраўды — адна з самых галоўных «фішак» праграмы. Усе артысты, які б нумар яны ні выконвалі, выступаюць на каньках. Лядовае пакрыццё дзякуючы спецыяльнай канструкцыі можа вытрымліваць неверагодна цяжкія дэкарацыі і не трэскацца. Яго стварала італьянская кампанія. Каманда «Чараўніцтва на лёдзе», дарэчы, больш чым інтэрнацыянальная. Артысты прыехалі з Італіі, Кітая, Расіі, Беларусі, Канады і Аўстраліі. Само шоу завецца аўстралійскім, паколькі кампанія, якой яно належыць, зарэгістравана там. А да прыезду ў Беларусь «Чараўніцтва на лёдзе» паказвалі ў некаторых азіяцкіх краінах, напрыклад, у Сінгапуры і Малайзіі. Там гэтая праграма карысталася вялікай папулярнасцю.

— Я адзін з нешматлікіх беларусаў, якія пакуль што бачылі гэтае выступленне, — сказаў галоўны рэжысёр «Белдзяржцырка» Серж Бандарчук. — Гэта не тая праграма, дзе святло, касцюмы і пастаноўка адыгрываюць галоўную ролю. Тут у кожным нумары нейкі складаны трук. Да таго ж дэкарацыі вельмі прыгожыя, якасныя і дарагія. Усё абсталяванне для шоу каштуе прыкладна мільён еўра. Але на кошт квіткоў гэта не паўплывае.

— Сапраўды вартае гэтае шоу яшчэ і таму, што тут выступаюць не толькі цыркавыя артысты, але і прафесійныя фігурысты, — лічыць клоўн Алег Панукалін, адзін з удзельнікаў «Чараўніцтва на лёдзе».

У праграме задзейнічана 45 артыстаў і 12 тэхнікаў. Акрамя таго, ім дапамагаюць яшчэ каля 100 чалавек, што працуюць у нашым цырку. Да прыезду ў Беларусь «Чараўніцтва на лёдзе» паказвалі на сцэне плошчай у 30 квадратных метраў, беларуская ж арэна мае ўсяго 13 «квадратаў». Таму давялося крыху змяніць, напрыклад, харэаграфію нумароў. Таксама было створана некалькі новых касцюмаў для артыстаў і замоўлены паменшаныя копіі некаторых адзінак рэквізіту.

Што ж датычыць саміх нумароў, то тут вельмі шмат загадкавасці.

Аўтар і мастацкі кіраўнік праграмы Абраам КАСТАНЯН, кіраўнік артыстаў цырка Кітая Уэй МІН і галоўны рэжысёр Белдзяржцырка Серж БАНДАРЧУК.

Шматразовыя чэмпіёны свету па фігурным катанні.

У новай праграме — захапляльнае шоу акрабатаў з Кітая.

— Падрабязна пакуль расказваць не буду, бо ілюзія на тое і ілюзія, каб быць таямніцай. Усе мае рэпетыцыі звычайна праводзяцца ў закрытых памяшканнях, дзе прысутнічае мінімум людзей, — расказала адна з «зорак» шоу, ілюзіяністка Настасся Рыч. — Усе яны досыць «экстрымальныя» і вельмі маштабныя. Мае ілюзіі — адны з самых «вялікіх» у свеце. Рабіць іх на лёдзе — гэта трэба яшчэ было прызвычаіцца. Цяпер любая сцэна, відаць, здасца мне ідэальнай, — падзялілася артыстка.

Відавочна, таямніца таго, што ж мы пабачым у выкананні ілюзіяністкі, раскрыецца пасля прэм'еры, а вось пра акрабатаў «Чараўніцтва на лёдзе» вядома крыху больш. Уявіце сабе знешняе аздабленне будысцкіх храмаў, якое ўражвае хітраспляценнем арнаментаў і фігур. Хочацца бясконца стаяць ля будынка і доўга разглядваць усю тонкую працу майстроў. Нешта падобнае можна будзе ўбачыць падчас нумару, які выконваюць кітайскія артысткі-акрабаткі. Дзяўчаты выступаюць групай у адзінаццаць чалавек, на іх касцюмы колеру золата (дзякуючы яму і ствараецца гэты эфект «жывой архітэктуры»). На спецыяльным вялікім «стале» падчас выступлення «будуюцца» самыя неверагодныя піраміды, спляценні, падтрымкі. Акрабатычнае майстэрства кітаянак прымушае літаральна затойваць дыханне, хвалявацца і здзіўляцца.

Гледачоў чакае і шмат іншых цікавых нумароў, такіх як дрэсіраваныя папугаі Веньяміна Ігумнава, паветраная гімнастыка Сабрыны Аганьер, палёт пад назвай «Піраты» беларускага артыста Анатоля Шыкаўца. Наведаць прадстаўленне можна будзе да 12 снежня. Гэтая праграма падыходзіць і для дзяцей, і для дарослых.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

■

■ Хутка і зручна

ЗА МЯЖУ — ПЕХАМ АЛЬБО НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ

Для ўсіх, хто хоць аднойчы перасякаў мяжу, памежныя пераходы стойка асацыююцца з патокам машын, чэргамі і чаканнем, нават пры самым лепшым збегу абставін — ніяк не менш за гадзіну. Але ёсць і іншы варыянт — пераход «Перароў — Белавежа», дзе можна прайсці дзяржаўную мяжу фактычна без затрымкі, не глытаючы выхлапныя газы машын у час чакання, а дыхаючы свежым гаючым пушчанскім паветрам. Гэты пераход знаходзіцца ў самай глыбіні Белавежскай пушчы. Ён абсталяваны для пешаходаў і веласіпедыстаў.

Фота Святланы ЯСКЕВІЧ.

Так выглядае новы пункт пропуску.

Фота БЕЛТА.

Пункт пропуску «Перароў», дарэчы, дзейнічае з 2005 года. З нашага боку ён знаходзіцца ў Пружанскім раёне, а назву атрымаў ад бліжэйшага населенага пункта — вёскі Перароў. Раней пераход уяўляў сабой вузкі драўляны тунэль, такія часта будуюць на вуліцы для пешаходаў на час рэканструкцыі або рамонту высокіх будынкаў. Увесь памежны і мытны кантроль ажыццяўляўся на польскім баку, бо там з самага пачатку была адпаведная інфраструктура.

І вось у 2012 годзе за сродкі рэспубліканскага бюджэту пачалося будаўніцтва памяшкання пункта пропуску на нашым баку. За год Камянецкая ПМК-14 узвяла прыгожы драўляны будынак, які нечым нагадвае сучасныя заможныя агрэсядзібы, а таксама шэраг іншых аб'ектаў. Комплекс пункта ўключае ў сябе адміністратыўны і тэхнічны будынкі, паркоўку на тры аўтамабілі, ачышчальныя збудаванні і артэзіянскія свідравіны, а таксама іншыя неабходныя памяшканні інфраструктуры.

Цікава, што дарогі, якія падыходзяць да пункта пропуску, дазваляюць перасякаць мяжу на аўтатранспарце, але і з беларускага, і з польскага боку ў гэтым месцы пушчанскі лес уяўляе сабой запаведную зону. Таму пра аўтапераход не магло быць і гаворкі. Тут дазваляецца толькі экалагічна чысты веласіпед. «Перароў — Белавежа» будзе выкарыстоўвацца пры правядзенні сумесных навуковых экспедыцый і форумаў па праблемах трансгранічнага аб'екта Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА «Белавежская пушча». Пра гэта не раз гаварылі вучоныя з абедзвюх краін.

Ну і галоўныя надзеі, якія звязваюцца з абноўленым пераходам, датычаць развіцця турызму ў нашым рэгіёне. Пра гэта сказаў падчас урачыстага адкрыцця пункта пропуску старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР. Кіраўнік Дзяржпагранкамітэта Аляксандр БАЕЧКА, у сваю чаргу, адзначыў, што супрацоўнікі іх ведамства зробяць усё, каб новы пераход стаў для турыстаў і мясцовых жыхароў хуткім, зручным і прыемным.

Пешаходна-веласіпедны пункт пропуску працуе з 1 красавіка да 30 верасня з 9 да 21 гадзіны, а з 1 кастрычніка да 31 сакавіка на дзве гадзіны менш — з 10 раніцы да 20 вечара.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Пружанскі раён

■

■ Праверана на сабе

НЯЛЁГКІ ПЕРАХОД НА «ЛІЧБУ»

У краіне ідзе кампанія пераходу на лічбавае тэлебачанне. Але, упэўнены, для многіх чытачоў такі пераход застаецца не зусім зразумелым працэсам. Калі, напрыклад, у кватэры, доме 2—3 і больш старых тэлевізараў, куды звяртацца, каб пераход на «лічбу» заняў менш часу? Высветлілася, што тыя, хто ў свой час купілі нават тэлевізары з «плоскім» экранам, не могуць разлічваць на лёгкі варыянт. Бо «плоскі» тэлевізар не азначае, што ён абавязкова ўжо гатовы прымаць сігнал новай якасці.

ЗМАРНАВАЎ ПАЎДНЯ, КАБ ЗРАЗУМЕЦЬ

Карэспандэнт «Звязды» паспрабаваў перайсці на «лічбу». І здзівіўся, што, нягледзячы на шэраг публікацый у СМІ па тэме, адразу разабрацца ва ўсіх нюансах не вельмі проста. А гледачы ў паважаным узросце, думаю, у большасці выпадкаў «адчуюць сябе дурням» з-за неабходнасці ўнікаць ва ўсе тэхнічныя нюансы з назвамі тэхнічных тэрмінаў.

Два тэлевізары «Віцязь» у маёй кватэры не могуць прымаць «лічбу». У абласным тэхнагандлёвым цэнтры «Гарант», які аказвае паслугі кабельнага тэлебачання (там прымаюць заяўкі ў выпадках, калі трансляцыя няўстойлівая), папрасілі патэлефанаваць у майстэрню. У майстэрні растлумачылі, што трэба самому купіць прыстаўку, кошт якой каля 700 тысяч рублёў (калі два тэлевізары, патрэбны дзве прыстаўкі), прыйсці з ёй (імі) у майстэрню… І там на працягу сутак зробяць так, каб з кожнай прыстаўкі быў доступ да закадзіраваных пакетаў тэлепраграм. «Перашыюць» — так гэта называецца на мове прафесіяналаў. І гэта каштуе некалькі дзясяткаў тысяч рублёў — за кожную прыстаўку. Потым трэба забраць прыстаўкі. А настройваць іх трэба самастойна — хоць чалавеку, далёкаму ад тэхнікі, гэта будзе цяжка зрабіць. Чаму нельга прапанаваць кліенту магчымасць за раз усе паслугі «пад ключ»? Пытанне застаецца адкрытым.

Па тэлефоне 172 (нумар перыядычна рэкламуюць у СМІ, каб звярталіся па пытаннях пераходу на лічбавае тэлебачанне) адказалі, што могуць параіць толькі наконт пераходу на «лічбу» для 8-і так званых «сацыяльных» каналаў.

Вырашыў патэлефанаваць на нумар 123 у «Белтэлекам», паколькі з'яўляюся абанентам паслугі byfly. Сказалі, што па тэлефоне ўсё роўна не падключаць. Дык мне ж толькі кансультацыю!.. Патэлефанаваў у сэрвісны цэнтр, і высветлілася, што трэба толькі схадзіць у гэты цэнтр і заключыць дамову на «ZALA». І ўсё неабходнае абсталяванне прадставяць бясплатна. Праўда, што датычыцца другога тэлевізара, як высветлілася, можа ўзнікнуць пытанне з тэхнічнага пункту гледжання. Маўляў, ці дазволіць хуткасць перадачы пакета каналаў падаваць іх на два тэлевізары? — спецыялісту трэба на месцы гэта праверыць.

АБСТАЛЯВАННЕ Ў РАСТЭРМІНОЎКУ

Па каментарый звярнуўся ў аблвыканкам. Там нагадалі, што, згодна з Дзяржаўнай праграмай укаранення лічбавага і радыёвяшчання ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца пераход з эфірнага тэлевізійнага вяшчання на лічбавы фармат стандарту DVB-T з ужываннем кадзіравання MPEG-4. Ён накіраваны на забеспячэнне насельніцтва агульнадаступным бясплатным пакетам тэлевізійных праграм з 8 тэлеканалаў: БТ-1, БТ-2, БТ-3, АНТ, СТВ, НТВ-Беларусь, РТР-Беларусь, МІР і адной гукавой праграмы — Першага Нацыянальнага канала Беларускага радыё.

Паводле інфармацыі на 1 ліпеня, насельніцтва рэспублікі ахоплена лічбавым тэлевізійным вяшчаннем стандарту DVB-T больш як на 95,9%, у Віцебскай вобласці — на 84,2%.

Для тых, хто не падключаны да кабельнага тэлебачання, на час пераходнага перыяду паралельна захоўваецца трансляцыя агульнадаступнага пакета тэлевізійных праграм у аналагавым і лічбавым фармаце. Абаненты кабельнага тэлебачання атрымліваюць гэты пакет без лічбавых прыставак, паколькі фірмы-аператары маюць тэхнічную магчымасць пераўтвараць лічбавы сігнал у аналагавы.

З 1 красавіка 2014 года, паводле зацверджанага Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь графіка, у рэгіёнах вобласці пачнецца паэтапнае адключэнне аналагавых перадатчыкаў. Адпаведным рашэннем Дзяржаўнай камісіі па радыёчастотах пры Савеце бяспекі Рэспублікі Беларусь устаноўлены тэрмін завяршэння трансляцыі тэлевізійных сігналаў у аналагавым фармаце — да 17 чэрвеня 2015 года.

Для прыёму агульнадаступнага пакета тэлевізійных праграм у лічбавым фармаце неабходна:

— мець лічбавы тэлевізар з падтрымкай стандарту DVB-T і фармату кадзіравання MPEG-4/AVC альбо лічбавую тэлевізійную прыстаўку (цюнар) з аналагічнымі параметрамі, якая падключаецца да звычайнага тэлевізара;

— падключыць цюнар да тэлевізара ў адпаведнасці з інструкцыяй па эксплуатацыі і настроіць яго на адпаведны канал;

— усталяваць прыёмную антэну дэцыметровага дыяпазону хваляў з гарызантальнай палярызацыяй і зарыентаваць яе на РТПС.

У крамах Віцебска прадаецца да 10 розных мадэляў цюнараў па цане ад 275 да 940 тысяч рублёў. Гандлёвымі прадпрыемствамі прадугледжаны продаж абсталявання для прыёму лічбавага тэлебачання ў крэдыт, растэрміноўку тэрмінам ад 3 да 12 месяцаў.

Для інфармавання грамадзян па пытаннях, звязаных з пераходам на лічбавае эфірнае тэлевізійнае вяшчанне, працуе «гарачая лінія».

НЕ ЎСЕ ЦЮНАРЫ ЯКАСНЫЯ

Для абанентаў кабельнага тэлебачання фірмы-аператары аказваюць дадатковую паслугу — трансляцыю тэлепраграм у лічбавым фармаце стандарту DVB-C (лічбавы камерцыйны пакет). Каб атрымаць доступ да закадзіраваных пакетаў пры наяўнасці старой мадэлі тэлевізара, неабходна набыць цюнар стандарту DVB-C з ушчыльненнем MPEG-4 тыпу «Віцязь HDR-826». Яго кошт каля 700 тысяч рублёў. Больш танныя цюнары («Віцязь HDR-803/805») не даюць магчымасці апрацоўваць сігналы высокай выразнасці, што будзе выклікаць праблемы з якасцю прыёму тэлевізійных праграм.

Пры наяўнасці двух тэлевізараў, у якіх няма прылады для апрацоўкі лічбавых сігналаў, спатрэбіцца набыць цюнары да кожнага.

З 1 красавіка 2014 года, паводле зацверджанага Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь графіка, у рэгіёнах вобласці пачнецца паэтапнае адключэнне аналагавых перадатчыкаў.

Падрабязная інфармацыя аб стандартах, абсталяванні для апрацоўкі лічбавых сігналаў, параметрах і парадку настройкі на лічбавыя тэлеканалы размешчана, напрыклад, на інтэрнэт-сайце Віцебскага абласнога тэхнагандлёвага цэнтра «Гарант» www.vgarant.net. Бясплатную кансультацыю можна атрымаць і па тэлефоне.

«ZALA» ТОЛЬКІ НА АДЗІН ТЭЛЕВІЗАР

Адной з пераваг падключэння паслугі лічбавага інтэрактыўнага тэлебачання «ZALA» з'яўляецца адсутнасць неабходнасці ў набыцці спецыяльнага абсталявання — яно выдаецца структурнымі падраздзяленнямі РУП «Белтэлекам» без спагнання дадаткавай платы на тэрмін дзеяння адпаведнага дагавора на паслугу.

Пры гэтым першапачатковая настройка абсталявання ажыццяўляецца спецыялістам бясплатна. Існуе магчымасць выбару як асноўнага, так і дадатковых тэматычных пакетаў.

— Разам з тым звяртаем увагу, што на момант вашага звароту ў Віцебскага філіяла «Белтэлекама» маецца тэхнічная магчымасць для падключэння паслугі лічбавага інтэрактыўнага тэлебачання «ZALA» заяўніку толькі на адзін тэлевізар. Тэхнічнай магчымасці для замены на іншы абаненцкі нумар альбо лінейнай магчымасці для падключэння другой прыстаўкі сёння няма. У дачыненні да вашых зваротаў па тэлефонах 172 (Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь) і 123 («Белтэлекам») тлумачым, што па першым з іх даюцца кансультацыі па арганізацыі сацыяльнай паслугі — прыёму лічбавага эфірнага вяшчання стандарту DVB-T (агульнадаступных бясплатных пакет тэлевізійных праграм), а па другім — па атрыманні камерцыйнай паслугі IP-тэлебачання па тэлефонных каналах сувязі (гандлёвая марка «ZALA»). Абодва варыянты адносяцца да лічбавага тэлебачання, але трансляцыя ў несумяшчальных паміж сабой стандартах (DVB-T і IP) і патрабуюць установкі рознага абсталявання, — паведаміў **Анатоль ДЗІУЛІН, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама.**

P.S. *У любым выпадку не трэба чакаць таго моманту, калі вы аднойчы ўключыце тэлевізар і ўбачыце толькі «экран у палосачку». Ці не прасцей насамрэч купіць новы тэлевізар, які на 100% будзе лічбавым? І хай гэта нашмат даражэй, чым купляць тую ж прыстаўку, але, пагадзіцеся, так перайсці на «лічбу» пакуль, напэўна, будзе прасцей.*

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■